*Вольга Белякова*

# УЗАЕМАСУВЯЗЬ СТРУКТУРНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ СІСТЭМЫ КАШТОЎНАСЦЕЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Разнастайныя фальклорныя тэксты ўвабралі ў сябе выпрацаваныя традыцыйнай народнай культурай спосабы бачання і ацэнкі свету, тыя каштоўнасныя арыентацыі, якімі карысталася асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў. У свядомасці прадстаўнікоў традыцыйнай культуры, аб'яднаных традыцыйным ладам жыцця, строгай рэгламентацыяй усіх яе сфер, рытмічным перажываннем жыцця ў абрадах і рытуалах, існавала патрэба мадэляваць ужо ўсталяваную традыцыяй карціну свету, увесь час вяртацца да «спрадвечных узораў», якія напоўнены глыбокім жыццёва важным зместам. Фальклор з'яўляецца адным са спосабаў фіксацыі і трансляцыі культурнай інфармацыі і сацыяльнага вопыту, сродкамі далучэння індывідаў да існуючых у дадзеным грамадстве каштоўнасцей.

Каштоўнасці ёсць «структурныя феномены суб'ектыўнай рэчаіснасці, якія адказваюць за захаванне і трансляцыю найбольш істотных і запатрабаваных на канкрэтным гістарычным этапе сэнсаў, норм, ацэнак культуры. Каштоўнасць уключае самі формы быцця, іх ідэальныя мадэлі і крытэрыі суадносін паміж мадэлямі і формамі» [4, с. 125].

Істотнымі якаснымі характарыстыкамі каштоўнасцей з'ўляюцца іх надындывідуальнае паходжанне, іерархічнасць аксіясферы (мы падзяляем каштоўнасці на ядро - першасныя каштоўнасці - мэты і інструментальныя - другасныя, якія выконваюць у адносінах да першых ролю сродкаў па іх рэалізацыі), а таксама абавязковае эмацыянальнае прыняцце каштоўнасці асобай - яна перажываецца як пажаданы стан быцця, таму яе дырэктыўнасць амаль заўсёды не сустракае ўнутранага супраціўлення [5, с. 32]. У галіне даследавання каштоўнасцей было створана некалькі асноўных методык, выкарыстоўваюцца і колькасныя, і якасныя прыёмы. Аднак усе гэтыя методыкі створаны ў XX ст., адштурхоўваюцца ад сутнасных характарыстык сучаснага чалавека і таму «не працуюць» у адносінах да чалавека эпох папярэдніх. Да таго ж, амаль усе сацыялагічныя і псіхапагічныя методыкі абапіраюцца на апытанне, якое немагчыма пры даследаванні традыцыйнай культуры.

Пры даследаванні сістэмы традыцыйных каштоўнасцей на аснове беларускай вусна-паэтычнай творчасці мы апабіраліся на апісальна-аналітычны метад К. Клакхана [6, с. 75 - 78] і методыку Ф. Клакхан - Ф.Стродбека [7], выкарыстоўваючы два яе параметры (чалавек і прырода, чалавек і чалавек), а таксама дадалі яшчэ адзін паказчык асэнсавання свету - апазіцыю «сваё - чужое». Для абагульнення апісання свету чужых мы ўводзім тэрмін «экстранальны» (ад лац. extranalis - «чужы», «непадобны», «варожы»), які аб'ядноўвае ўвесь спектр уяўленняў пра розныя катэгорыі чужых, якіх мы разумеем максімальна шырока - сацыяльных, этнічных, культурных, сутнасных (фантастычныя істоты) супрацьлегласцей свету сваіх. Такім чынам, для вывучэння каштоўнасцей традыцыйнай культуры мы вылучаем тры сферы аксіялагічнага асэнсавання: прыроднае асяроддзе, адносіны паміж людзьмі і экстранальны свет.

Структура аксіясферы беларускай вусна-паэтычнай творчасці складаецца з двух узроўняў: фундаментальнага (базіснага) і інструментальнага [I.e. 17]. Фундаментальныя каштоўнасці семантычна аб'ядноўваюцца ў ядро: адзіны сінкрэтычны комплекс, які складае аснову традыцыйнай карціны свету беларусаў. Базісныя аксіялагічныя дамінанты лічыліся беларусамі перададзенымі ў спадчыну ад продкаў і таму сакральнымі, былі духоўным падмуркам існавання суб'екта беларускай традыцыйнай культуры.

Інструментальны ўзровень сістэмы каштоўнасцей традыцыйнай культуры ўтвараюць земляробчы, сацыяльны і экстранальны каштоўнасна-нарматыўныя комплексы [3, с. 70].

Узаемазалежныя і ўзаемаабумоўленыя адносіны складнікаў земляробчага каштоўнасна-нарматыўнага комплексу можна ахарактарызаваць як стан дынамічнай раўнавагі. Земляробчы каштоўнасна-нарматыўны комплекс факусіруе аксіялагічнае асэнсаванне беларусамі навакольнага асяроддзя. У яго склад уваходзяць: 1) аксіялагічны статус прасторава-часавага кантынууму традыцыйнай культуры (у адпаведнасці з бінарнай апазіцыяй «добры - шкодны» і рознымі ўзроўнямі суб'ектыфікацыі), 2) хлеб і сельскагаспадарчыя культуры як сакральны вынік земляробства, 3) дабрабыт (пастаянная колькасць пэўнага кола гаспадарчых даброт). Аксіялагічныя дамінанты земляробчага каштоўнасна-нарматыўнага комплексу прадстаўлены ў каляндарна-абрадавай вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, замовах, парэміях, тэатралізаваных элементах абрадаў і свят.

Для сацыяльнага каштоўнасна-нарматыўнага комплексу характэрны цэнтраімклівы механізм узаемасувязі, калі складнікі звязаны паміж сабой паслядоўна. Сацыяльны каштоўнасна-нарматыўны комплекс аб'ядноўвае каштоўнасныя дамінанты традыцыйнай культуры ў сферы сямейнага і грамадскага жыцця. Аксіялагічнымі адзінкамі гэтага комплексу з'яўляюцца: 1) доля (сукупнасць антрапалагічных і сацыяльных каштоўнасцей: якасць жыцця, сацыяльны статус, здароўе, шчасце), 2) каштоўнаснае асэнсаванне сувязей у сям'і (дамінанта вертыкалі) і абшчыне (дамінанта гарызанталі), 3) маральныя якасці, 4) каштоўнасці, звязаныя з абрадамі пераходу ў іншы свет, 5) эстэтычныя каштоўнасці. У вусна-паэтычнай творчасці сацыяльны каштоўнасна-нарматыўны комплекс найбольш разгорнута прадстаўлены ў сямейным цыкле абрадавай вусна-паэтычнай творчасці, часткова ў пазаабрадавых песенных жанрах, ігрышчах і гульнях, сацыяльна-бытавых і навелістычных казках, парэміях.

Аксіялагічныя адзінкі экстранальнага каштоўнасна-нарматыўнага комплексу характарызуюцца цэнтрабежным механізмам сувязі. Гэты комплекс ахоплівае адносіны паміж прадстаўнікамі абшчыны («сваімі») і рознымі групамі чужых, якія дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад катэгорыі прадстаўнікоў экстранальнай сферы: 1) кантакт з сакральнымі чужымі (продкамі), 2) раўнавага ў адносінах з прыроднымі чужымі (міфалагічнымі істотамі), 3) адлегласць у адносінах да сацыяльных чужых (захопнікаў, пана). Каштоўнасці экстранальнага комплексу выразней за ўсё прасочваюцца ў чарадзейных і сацыяльна-бытавых казках, паданнях, замовах, малых жанрах беларускай вусна-паэтычнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У аксіясферы беларускай традыцыйнай культуры мы вылучаем тры этапы фарміравання: агульначалавечыя, міжнацыянальна-асаблівыя і спецыфічныя каштоўнасці, што дазваляе прасачыць развіццё аксіясферы беларускай традыцыйнай культуры ў дыяхраніі. Агульначалавечыя складальнікі аксіясферы сфарміраваліся на ранніх этапах генезісу культуры чалавека - у перыяд міфалагічнага мыслення. Міжнацыянальна-асаблівыя рысы беларускай культуры і яе сістэмы каштоўнасцей фарміруюцца з перасяленнем усходніх славян на месцы канчатковай аседласці, стварэннем агульнаўсходнеславянскай культуры і наступным развіццём з яе беларускай, украінскай і рускай этнічных культур. Спецыфічныя ж рысы аксіясферы традыцыйнай культуры беларусаў вылучаюцца ў перыяд фарміравання беларускай нацыі [2, с. 4].

На дадзены момант у межах класічнай гуманітарнай навукі традыцыйная народная культура працягвае разглядацца з пазіцыі перавагі ўрбаністычнай культуры і выключна ў рамках апазіцыі «рацыяльнае - ірацыянальнае», што непазбежна вядзе да абмежавання іх актуалізацыі ў іншых культурна-гістарычных умовах. Па гэтай прычыне галоўным патрабаваннем сучаснага перыяду становіцца аб'ектыўнае асэнсаванне каштоўнасцей традыцыйнай культуры з пункту гледжання іх адпаведнасці надзённым патрэбам як асобнага чалавека, так і сусветнага грамадства ў цэлым.

Як ураўнаважаная сістэма, каштоўнасці традыцыйнай культуры могуць спрыяць вырашэнню глабальных праблем сучаснасці, пераадоленне якіх знаходзіцца на мяжы пераходу ад індывідуалізму і супрацьстаяння да іншага прынцыпу сацыяльных адносін.

**Спіс літаратуры:**

1. Белякова, В.І. Беларускі фальклор як аксіялагічная сістэма / ВЛ. Белякова // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі. - Мінск : Бестпрынт, 2004. - С. 16-21.
2. Белякова, В.І. Традыцыйныя каштоўнасці беларусаў : суадносіны, віды і спецыфіка / В.І. Белякова // Научные труды РИВШ. Философско-гуманитарные науки : сб. научн. ст. / под ред. В.Ф. Беркова. - Минск : РИВШ, 2007. - Вып. 3. - С. 3-7.
3. Белякова, О.И. Традиционная белорусская культура как аксиологическая система / О.И. Белякова // Вести ИСЗ. - 2010. - № 1 - С. 69-74.
4. Дубровский. Д.И. Проблема идеального. Субъективная реальность / ДИ. Дубровский. - М.: Канон +, 2002. - 368 с.
5. Каган, М.С. Философская теория ценностей / М.С.Каган. - СПб.: Петрополис, 1997. - 225 с.
6. Kluckhohn, C. The Study of Values / C.KIuckhohn // Values in America - New York: Univ. of Notre Dame, 1961.-312p.
7. Hills M.D. Kluckhohn and Strodtbeck's values orientation theory / M.D.Hills // Online Readings in Psychology and Culture [Electronic resource]. - 2005. - Mode of access: http://www.ac.wwu.edu/~culture/Hills.html. - Date of access: 25. 10.2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ